Список цитированных источников:
1. Сухомлинский, В.А. Сердце отдаю детям / В.А. Сухомлинский. – Киев: Радянська школа, 1974. – 288 с.
2. Ушинский, К.Д. Человек как предмет воспитания. Опыт педагогической антропологии / К.Д. Ушинский. – Ленинград: Издательство Академии педагогических наук, 1948.
3. Усова, А.П. Роль игры в воспитании детей / А.П. Усова. – М.: Просвещение. 1976. – 96 с.

**ПАПУТНІКАВА НАСТАССЯ ДЗМІТРЫЕЎНА**
Рэспубліка Беларусь, Мінск, БДПУ імя Максіма Танка

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ЛІТАРАТУРНА-ЭСТЭТЫЧНЫХ МІЖПРАДМЕТНЫХ СУВЯЗЯЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Урок беларускай літаратуры ў пачатковай школе – гэта, несумненна, адзін з важных і незаменных урокаў у сістэме адукацыі. Галоўнай задачай урокаў беларускай літаратуры ў пачатковай школе з'яўляецца актывізацыя пазнавальных памкненняў навучэнцаў у спасціжэнні беларускай нацыянальнай культуры, захаванні нацыянальна-культурных традыцый, развіцце вобразнага ўяўлення, маўленчай актыўнасці, здольнасці да літаратурнай творчасці на падставе ўспрынятых твораў мастацкай літаратуры [1, с. 1].

Чытанне – гэта базавы кампанент выхавання, адукацыі і развіцця культуры. Яно з'яўляецца дзейнасцю, якая фарміруе асобу, інструментам атрымання адукацыі і распаўсюджвання культуры, сведчаннем сфарміраванасці камунікатыўнай і прафесійнай кампетэнцыі спецыяліста, інструментам дасягнення поспеху чалавека ў жыцці [2, с. 2]. Выкладчыку важна мець грунтоўную метадычную падрыхтоўку, правільна вызначаць падыходы, формы, метады якаснага засваення і разумення вучнямі каштоўнасці беларускай літаратуры ў жыцці чалавека. Задачай выкладчыка становіцца развіваць не толькі пазнавальную сферу дзіцяці, але і садзейнічаць маральнаму, эмацыянальна каштоўнаснаму ўзбагачэнню асобы дзіцяці.

Настаўнік ўвесь час знаходзіцца ў пошуку эфектыўных сродкаў для лепшага засваення матэрыялу навучэнцамі на ўсіх этапах урока літаратурнага чытання: этапе падрыхтоўкі да ўспрымання мастацкага твора, на этапе яго чытання і аналізу, на этапе паўторнага чытання твора і фармулявання галоўнай думкі тэксту. Але ў сучасных умовах жыцця і наяўнасці розных сацыяльных фактараў нават прафесіяналу бывае цяжка зацікавіць сучасных навучэнцаў чытаннем кніг.

Літаратурная адукацыя, безумоўна, павінна быць накіравана на эмацыянальна-пачуццёвую сферу навучэнцаў, яе развіццё і ўзбагачэнне. Эмоцыі, якія ў жыцці дзіця атрымлівае праз зносіны з настаўнікам, сябрамі, роднымі – гэта толькі адзін бок разглядаемага пытання. Задача настаўніка – паказаць эмацыянальные багацце літаратуры. Без спецыяльнай падрыхтоўкі не кожны вучань здолее паўнавартасна адчуць эмоцыяі чытача і аўтара паэтычнага твора, прыгажосць эпітэтаў, метафар, фразеалагізмаў, афарызмаў.

Добрымі "памочнікамі" ў пошуку эфектыўных сродкаў літаратурнай адукацыі могуць стаць розныя віды мастацтва – рэалізацыя міжпрадметных сувязяў на ўроках беларускага літаратурнага чытання. Міжпрадметныя сувязі – гэта ўзаемадзеянне паміж зместам асобных вучэбных прадметаў, дзякуючы чаму дасягаецца ўнутранае адзінства адукацыйных праграм [3, с. 7]. У дадзеным артыкуле мы разгледзім рэалізацыю міжпрадметных сувязяў паміж літаратурай, выяўленчым і музычным мастацтвам на ўроках літаратурнага чытання.

Выяўленчае мастацтва, а канкрэтна жывапіс, можа выкарыстоўвацца практычна на ўсіх этапах урока літаратурнага чытання. Пры адпаведных метадычных умовах эфектыўнасць можа быць дасягнута на этапах падрыхтоўкі да першаснага ўспрымання матстцкага твора, этапе аналізу і другаснага сінтэзу. Гэта стымулюе дзіця да развіцця яго творчых здольнасцяў і ажыццяўляе працу над эмацыянальнай сферай дзіцяці. У якасці творчых заданняў навучэнцам можна прапанаваць выказаць уласныя думкі і эмоцыі пасля чытання твора на паперы ў выглядзе малюнка, прадставіць сюжэт ва ўласных фарбах, стварыць дыяфільм і інш.

Наглядным прыкладам для дзяцей могуць паслужыць рэпрадукцыі сусветна вядомых карцін да літаратурных твораў як замежных, так і беларускіх мастакоў. Напрыклад, вывучаючы вершы па порах года, выдатным адлюстраваннем пейзажаў будуць служыць карціны

беларускага жывапісца Вітольда Каэтанавіча Бялыніцкага-Бірулі. Цікавымі прыкладамі побыту беларускага народа будуць з'яўляцца і прадметы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Іх вывучэнне дапаможа пры чытанні фальклорных твораў: казак, легенд, паданняў. Працэс ўспрымання ў такім выпадку з'яўляецца не толькі простым прыёмам інфармацыі, але і актыўнай дзейнасцю. Ён стварае карціну навакольнай рэчаіснасці. Успрыманне пры чытанні літаратуры мае такія ж якасці, як ўспрыманне пры судотыку з творамі любога віду мастацтва – гэта цэласнасць, творчы характар і актыўнасць.

Значную дапамогу ў падрыхтоўцы да ўрока беларускай літаратуры прапануюць і творы музычнага мастацтва. Дадзены спосаб можа быць карысным на ўсіх этапах падрыхтоўкі да чытання. Музычныя кампазіцыі можна выкарыстоўваць як для "ўвядзення" вучняў у тэму ўрока, так і ў плыні чытання і аналізу літаратурнага твора.

Многія класічныя творы адлюстроўваюць сутнасць таго ці іншага тэксту, але не варта забываць пра кампазіцыі сучасных аўтараў. Адзначым, што некаторыя з такіх музычных твораў могуць быць напісаны спецыяльна пад той ці іншы тэкст. Адпаведна, цікавымі напрамкамі дзейнасці могуць быць чытанне верша, затым – яго аналіз, а пасля – слуханне песні, словы якой былі пакладзены на музыку. Дзякуючы такой паслядоўнасці працы дзіця яшчэ ярчэй зможа прааналізаваць вобразныя сродкі. Гэта дапаможа настаўніку заўважыць у сваіх навучэнцаў новыя грані асобы, пункты гледжання, творчы патэнцыял, які можа быць схаваным пры звыклым, "сухім" і часам нецікавым чытанні тэкстаў.

Пры чытанні вершаў можа таксама выкарыстоўвацца прыём "чытанне пад музыку". Пры такой дзейнасці працуюць практычна ўсе органы пачуццяў (слых, зрок і інш.), выпрацоўваюцца маўленчыя навыкі, выразнасць чытання. Адпаведна мысленне дзіцяці засвойвае і злучае ў свядомасці больш вобразаў, паняццяў з дапамогай вобразных сродкаў. Гэта з'яўляецца выдатнай трэніроўкай для мозга і яго творчай актыўнасці. Такім чынам настаўнік спрыяе рознабаковаму развіццю дзіцяці. Навучэнцы сучаснага свету растуць у эпоху гаджэтаў, што можа выклікаць недахоп эмацыянальнага і культурнага досведу. Пошук слоў-апісанняў, метафар спрыяе развіццю слоўнікавага запасу, эмацыянальнаму насычэнню пад час чытання.

Чытанне верша на памяць пад музыку ў час праверкі дамашняга задання дазваляе дзіцяці лягчэй засяродзіцца і ўспомніць тэкст, таму што на ўроку пры аналізе тэксту і адначасовым праслухоўванні музычнай кампазіцыі навучэнец уявіў пэўныя вобразы, якія несумненна запомніць. Такім чынам музыка і літаратура могуць спрыяць развіццю памяці.

У сучасным свеце важна разумець, што чалавек з багатымі маральнымі каштоўнасцямі, падмацаванымі эмоцыямі – гэта той чалавек, які лёгка адрозніць дабро ад зла, ветлівасць ад фанабэрыстасці, праўду ад хлусні. Гэта і ёсць задача сучаснай літаратурнай адукацыі – праз традыцыйную і медыйную адукацыю даць навучэнцам грунтоўныя веды пра навакольны свет сродкамі кнігі, выхоўваць маральныя каштоўнасці асобы.

Медыяадукацыя ў сучасным свеце разглядаецца як працэс развіцця асобы з дапамогай і на матэрыяле сродкаў масавай камунікацыі (медыя) з мэтай фарміравання культуры зносін з медыя, творчых, камунікатыўных здольнасцяў, крытычнага мыслення, уменняў паўнавартаснага ўспрымання, інтэрпрэтацыі, аналізу і ацэнкі медыятэксту, навучання розных формаў самавыяўлення пры дапамозе медыятэхнікі. Медыяпісьменнасць дапамагае чалавеку актыўна выкарыстоўваць магчымасці інфармацыйнага поля тэлебачання, радыё, відэа, кінематографа, прэсы, інтэрнэту, дапамагае яму лепш зразумець мову медыякультуры [2, с. 2].

Сучасных дзяцей, безумоўна, цікавіць мультыплікацыя. Таму выдатным сродкам павышэння інтарэсу вучняў да літаратурных твораў можа стаць прагляд і аналіз мультфільма, створанага паводле твораў дзіцячай літаратуры, у тым ліку – вядомых дзецям казак з падручнікаў і хрэстаматый. Мноства мультфільмаў выпускае кінастудыя "Беларусьфільм". З поспехам на ўроках беларускай літаратуры можа выкарыстоўваць мультфільм "Лагодны воўк", 2018 г. (рэж. Наталля Дарвіна) па матывах казкі беларускай пісьменніцы Алены Масла. Пасля чытання казкі дзецям будзе цікава паглядзець увасабленне персанажаў твора мультыплікатарамі, зразумець творчы погляд на экранізацыю.

Добрым спосабам дапамагчы дзецям навучыцца разумець вершы будзе прагляд "мультвершаў" на беларускіх ютуб-каналах. Прадстаўніком такога выгляду экранізацый з'яўляецца Андрэй Скурко. Мультвершы дапамагаюць дзецям зразумець, што літаратура і завучванне вершаў напамяць – гэта не сумна, а вельмі цікава. Важна даць навучэнцам адчуць сувязь паміж эмацыянальным і пазнавальным аспектамі літаратурнага твора.

Такім чынам, можна з упэўненнасцю казаць аб тым, што міжпрадметныя сувязі на ўроках беларускага літаратурнага чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі маюць вельмі высокую метадычную вартасць, дапамагаюць зрабіць урокі літаратурнага чытання больш цікавымі для вучняў, узмацняюць матывацыю да чытання кніг. Выкарыстанне магчымасцяў іншых вучэбных прадметаў у пачатковай школе, такіх як, жывапіс, скульптура, дэкаратыўнае мастацтва (урокі выяўленчага мастацтва), музычныя творы розных жанраў (урокі музыкі), адукацыя з дапамогай сучасных медыятэхналогій – усё гэта выдатныя магчымасці і "памочнікі" у літаратурнай сферы адукацыі. Пры гэтым фарміруюцца чытацкія ўменні вучняў, раскрываецца творчы патэнцыял маленькіх чытачоў, адбываецца ўзбагачэнне пазнавальнай, маральнай і эмацыянальна сфер асобы, што дае магчымасць адзначыць эфектыўнасць міжпрадметных сувязяў на ўроках беларускай літаратуры.

Спіс цытаваных крыніц:
1. Учебные программы по учебным предметам. II класс "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)" // Национальный образовательный портал [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://adu.by/ru/homepage/obrazovatelnyj-protsess-2020-2021-uchebnyj-god/obshchee-srednee-obrazovanie-2020-2021/303-uchebnye-predmety-i-iv-klassy-2020-2021/3799-ii-klass.html. – Дата доступа: 30.08.2022.
2. Ковалевская, Н.И. Влияние медиасреды на формирование читательской грамотности подростков / Н.И. Ковалевская, Л.И. Петрова; Бел. гос. технол. ун-т. – М., 2018. – 7 с.
3. Ляшук, В.Я. Міжпрадметныя сувязі ў выкладанні беларускай мовы і літаратуры / В.Я. Ляшук, Г.М. Малажай. – Мінск: Народная асвета, 1992. – 126 с.

**РАЛОВЕЦ ГЕРМАН АНДРЕЕВИЧ**
Республика Беларусь, Витебск, ГУО «Средняя школа № 11 г. Витебска»

## ТЕОРЕТИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ПРОБЛЕМЫ ФОРМИРОВАНИЯ ПОЗНАВАТЕЛЬНОГО ИНТЕРЕСА ОБУЧАЮЩИХСЯ

На современном этапе развития общества наличие познавательного интереса требуется во всех сферах жизнедеятельности. Это говорит о том, что он является одной из главных характеристик успешного человека. Именно поэтому одной из ключевых задач современного образования становится развитие познавательного интереса. Школа призвана обеспечить обучающемуся успешность в учебной деятельности, его личностное развитие. Формирование устойчивого познавательного интереса обучающихся относится к одной из центральных проблем современной школы.

Познавательный интерес, будучи одним из видов интереса вообще, характеризуется особым познавательным отношением, окрашенным интеллектуальной эмоцией, и непосредственным мотивом, идущим от самой деятельности. С точки зрения научной значимости познавательный интерес является важным фактором совершенствования процесса обучения и одновременно показателем его эффективности и результативности, так как он стимулирует познавательную активность, самостоятельность, творческий подход к овладению материалом, побуждает к самообразованию.

Сегодня обществу нужны люди самостоятельные, умеющие принимать нестандартные решения. Эти качества формируются в школьном возрасте. Но сегодня остро стоит проблема утраты желания обучающихся учиться. Одна из основных причин этого нежелания кроется в потере интереса к самим знаниям и к формам их получения. Однако успешность зависит от правильного подхода к обучающимся и выборе современных средств, приёмов и методов, в том числе и авторских.

Таким образом, проблема формирования познавательного интереса у обучающихся актуальна в настоящее время для построения учебного процесса. Каждый учебный предмет в зависимости от предметного содержания раскрывает возможности для развития познавательного интереса.

В современных реалиях необходимо заинтересовать обучающегося учебным предметом, вызывая у него интерес, стимулируя активизацию познавательной деятельности. То есть, познавательный интерес укрепляется благодаря повышению активности обучающихся в процессе обучения.

Целью исследования является изучение теоретических аспектов процесса формирования познавательного интереса обучающихся.